# «Маладняк» – старонка гісторыі беларускай літаратуры




***Тэматычная выстава пад такой назвай, прымеркаваная да 100-годдзя з часу ўтварэння першага літаратурнага аб'яднання пісьменніцкай моладзі «Маладняк», праходзіць з 18 кастрычніка па 3 снежня ў зале беларускай літаратуры (пам. 205) Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.***

Літаратурнае аб'яднанне «Маладняк» было створана пры аднайменным часопісе, які выдаваўся ў Мінску. Заснавальнікамі яго сталі пісьменнікі Міхась Чарот, Алесь Дудар, Андрэй Александровіч, Адам Бабарэка, Язэп Пушча, Анатоль Вольны. На той час толькі адзін з іх, Міхась Чарот, меў выдадзеныя творы – паэму «Босыя на вогнішчы» і зборнік вершаў «Завіруха». З другой хваляй да згуртавання далучыліся Паўлюк Трус, Алесь Якімовіч, Язэп Падабед, Яўгенія Пфляўмбаўм, Нічыпар Чарнушэвіч, Кузьма Чорны і інш. Ініцыятыву заснавальнікаў падхапілі на месцах: былі створаны філіялы «Маладняка» ў Віцебску, Полацку, Магілёве, Оршы, Бабруйску, а таксама за межамі Беларусі – у Маскве, Рызе, Ленінградзе, Празе. Згуртаванне прайшло складаны, часам супярэчлівы шлях: ад літгуртка з шасці чалавек да Усебеларускага аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк», якое ў 1925 годзе налічвала больш за 300 чалавек.

Літаб'яднанне займалася актыўнай выдавецкай дзейнасцю. На свае сродкі выпускала бібліятэчку «Кніжніца "Маладняка"», з кастрычніцкага нумара 1926 года – аднайменны часопіс, планавала выданне бібліяграфічнага паказальніка. Праіснавала яно да ліпеня 1928 года, а потым было рэарганізавана ў Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў (БелАПП).

Выстава знаёміць з шырокім колам як асобных выданняў твораў маладнякоўцаў 1920 – 1930-х гадоў, так і з іх часопіснымі публікацыямі. Побач з тагачаснымі прадстаўлены сучасныя выданні, у тым ліку ў серыях «Залатая бібліятэка беларускай літаратуры», «Бібліятэка беларускай прозы» і інш. Аб дзейнасці арганізацыі, жыццёвым і творчым лёсе яе ўдзельнікаў расказваюць матэрыялы раздзела «"Маладняк" у беларускім літаратуразнаўстве: учора і сёння».

«Маладняк» зведаў узлёты і падзенні, меў свае выйгрышы і страты, заўсёды быў у пошуках творчых адкрыццяў. Не ўсе літаратурныя творы вытрымалі праверку часам, але ўжо сёння цалкам відавочна, што шлях маладой беларускай літаратуры да мастацтва шмат у чым быў шляхам «Маладняка».

Глыбей пазнаёміцца з літаратурным аб'яднаннем «Маладняк», гісторыяй яго стварэння і дзейнасці, унікальнымі фотаздымкамі маладнякоўцаў, іх выданнямі і іншымі матэрыяламі можна праз віртуальны праект Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі «На хвалі часу, у плыні жыцця».

*Паводле інфармацыі арганізатараў*